отчетных книг и составление сводных месячных карточек возлагалось на заведующего статистикой отделения банка.

В Российском государственном историческом архиве хранятся письма П.А. Столыпина, которые позволяют проследить ход подготовки и реализации столыпинской аграрной реформы. Примером может служить столыпинское письмо от 3 октября 1910 г., адресованное А.В. Кривошеину: «Мое мнение, что неуспех или задержка землеустройства в некоторых губерниях зависит от применения землеустроительными комиссиями слишком огульного приема – отнесения единичных выделов в третью очередь, т.е. «ad calendas graecas». Они пропустили между ушей рекомендацию Землеустроительного комитета не брезгать единичными выделами там, где они могут пробить брешь в деревенской косности, и во многих местах… дело остановилось. Я почерпнул это убеждение из бесед в экипаже с землеустроителями и предводителями, когда нам пускали пыль (черноземную) в глаза» [4, л. 20–21].

Таким образом, архивные источники по данной проблеме носят репрезентативный характер. С их помощью было установлено, что Крестьянский поземельный банк играл определяющую роль при попытке решения земельного вопроса в рамках столыпинской аграрной реформы. Деятельность банка во многом объясняет активную позицию крестьянского населения при создании единоличной собственности в форме хуторского и отрубного владения землей. Можно утверждать, что именно деятельность банка способствовала укреплению финансового положения крестьян накануне Первой мировой войны.

1. Кухаренко, А. А. Деятельность Крестьянского поземельного банка на территории Беларуси в период столыпинской аграрной реформы (1906–1914 гг.) / А. А. Кухаренко // Веснік БДУ. Сер. 3, Гіст. Экан. Права. – 2013. – № 2. – С. 15–18.
2. Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. – Ф. 29. – Оп. 1. – Д. 601. Дело о покупке фруктовых деревьев крестьянами Гродненской губернии для разведения фруктовых садов на хуторах имений Крестьянского поземельного банка, 1913–1917 гг.
3. Литовский государственный исторический архив. – Ф. 543. – Оп. 1. – Д. 6. Циркуляры о торгах, 1912–1915 гг.
4. Российский государственный исторический архив. – Ф. 1571. – Оп. 1. – Д. 324. Письма Петра Аркадьевича Столыпина, министра внутренних дел и других лиц, 1906–1915 гг.

**Карпекін К.Р.**

## КРЫНІЦЫ ПА ГЕНЕАЛОГІІ СЯЛЯНСКІХ РОДАЎ XIX – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX ст. (на прыкладзе роду Загурскіх з Лёзненшчыны)

Пераважная большасць генеалагічных даследаванняў, ажыццёўленых беларускімі гісторыкамі, тычыцца шляхецкіх і дваранскіх родаў. Пра гэта сведчыць дастаткова актыўнае выданне рознага кшталту гербоўнікаў, якое пачалося з 1990-х гг. [1; 20]. Разам з тым неабходна заўважыць, што ў перыяд уваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі і ў першыя паслярэвалюцыйныя дзесяцігоддзі ад 70 да 85% насельніцтва складалі сяляне. У сувязі з гэтым зусім заканамерна паўстае праблема вывучэння генеалогіі сялянскіх родаў як самага шматлікага саслоўя.

Мэта дадзенага даследавання – прааналізаваць дакументы генеалагічнага характару, якія тычацца сялянскіх родаў XIX – першай трэці XX ст.

У артыкуле аналіз крыніц ажыццёўлены на прыкладзе сялянскага роду Загурскіх, прадстаўнікі якога пражывалі на тэрыторыі Лёзненскай воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні (зараз – Лёзненскі раён Віцебскай вобласці).

Паводле агульнапрынятай класіфікацыі, да прамых генеалагічных крыніц па гісторыі сялянства адносяцца метрычныя кнігі, рэвізскія сказкі ды інвентары ўладанняў [19, с. 5]. Для аднаўлення радаводу спецыяльна выбраны род з Паўночна-Усходняй Беларусі, бо крыніцы па дадзеным рэгіёне ў архівах захаваліся не дастаткова добра, але ў той жа час страчаны не цалкам. Такім чынам, мы маем справу з сярэднестатыстычным выпадкам. У цэлым спецыялісты ацэньваюць ступень захаванасці дакументаў па Аршанскім павеце наступным чынам: рэвізскія сказкі памешчыцкіх сялян – 19% ад першапачатковага аб’ёму, метрычныя кнігі праваслаўных цэркваў – 13,2% [18, с. 94].

На працягу даследуемага перыяду большасць прадстаўнікоў роду Загурскіх пражывала ў в. Замошша, якая адносілася да прыходу Нова-Бельскай Успенскай царквы. Рэвізскія сказкі па згаданай вёсцы зусім не захаваліся, інвентароў памешчыцкіх маёнткаў, да якіх яна магла адносіцца (Альхімкава, Прудзішча ці Станіслава), таксама не выяўлена. Іншымі словамі, з прамых генеалагічных крыніц у распараджэнні даследчыкаў маюцца толькі метрычныя кнігі, але комплекс гэтых



Репозиторий ВГУ

крыніц таксама вельмі абмежаваны. На захаванні ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі маюцца толькі кнігі запісаў пра шлюбы за 1839–1848 гг., пра памерлых за 1839–1855 гг., пра нараджэнні, шлюбы і памерлых за 1871, 1872, 1875, 1877, 1878, 1881 гг. [17].

З дапамогай метрычных кніг выяўлены звесткі пра 17 асоб, пры гэтым знойдзена 5 дакладных запісаў пра нараджэнне, 2 запісы пра шлюб і 4 запісы пра смерць. Галоўнай цяжкасцю, з якой сутыкаецца даследчык пры працы з метрычнымі кнігамі праваслаўных цэркваў Усходняй Беларусі, гэта, акрамя дрэннай захаванасці, адсутнасць прозвішчаў асоб. Для таго, каб устанавіць сваяцкія сувязі паміж асобамі, даводзіцца супастаўляць імёны, параўноўваць паміж сабой запісы, датычныя розных асоб. Па прычыне адсутнасці поўнага камплекту метрычных кніг вельмі важна звяртаць увагу на наступныя звесткі: у запісах пра нараджэнне – пра імёны бацькоў (родных і хросных, якія нярэдка з'яўляліся сваякамі), у запісах пра шлюб – на ўзрост жаніха і нявесты, месца пражывання нявесты (дзякуючы гэтаму магчыма ўстанавіць час іх нараджэння, а таксама месца пражывання сваякоў нявесты), у запісах пра смерць – пра ўзрост памерлага (адпаведна, магчыма даведацца год нараджэння).

Важную інфармацыю ўтрымліваюць непрамыя генеалагічныя крыніцы. У архіўных справах, загалоўкі якіх утрымліваюць назву цікавячага населенага пункта, ёсць вялікая верагоднасць знайсці пэўныя біяграфічныя звесткі пра прадстаўнікоў таго ці іншага сялянскага роду. Як і ў метрычных кнігах, прозвішчы асоб у дакументах канца XIX – пачатку XX ст. не ўказаны. Напрыклад, у справе па разгляду спрэчкі паміж сялянамі в. Замошша наконт зямлі за 1895–1897 гг. утрымліваецца інфармацыя пра тое, што селянін Нікіфар Яўстаф'евіч з'яўляўся сельскім старастам [15, арк. 4 адв.]. У справе пра падзел на хутарскія ўчасткі в. Замошша за 1907 г. згадваюцца Платон і Фёдар Астапавічы (Яўстаф'евічы), а таксама Зенавей Платонавіч, якія паставіў подпісы за ўсіх непісьменных сялян [16, арк. 5].

Комплекс крыніц, узніклых пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і з дапамогай якіх магчыма даследаваць генеалогію сялянскіх родаў, – дастаткова разнастайны. Важным адрозненнем ад дакументаў папярэдняга перыяда з'яўляецца наяўнасць прозвішчаў. Разам з тым, дакументаў, у якіх дакладна ўказаны сваяцкія сувязі, захавалася няшмат. У якасці прыкладу варта прывесці "Спіс дзяцей 5-, 6-, 7-, 8-, 9-гадовага ўзросту Замашчанскага школьнага раёна" за 1929 г. У ім пералічаны дарослыя сяляне і іх дзеці з указаннем дакладнага ўзросту [7, арк. 122].

Для даследавання таксама варта выкарыстоўваць разнастайныя спісы асоб, у якіх, як правіла, пазначаны імёны, узрост (ці год нараджэння), пэўныя біяграфічныя дадзеныя (у залежнасці ад прычыны складання спіса). Нярэдка імёны сваякоў унесены ў такія спісы асобнымі групамі, што значна спрашчае працу. У працэсе даследавання радаводу Загурскіх былі выяўлены "Спіс непісьменных грамадзян Лёзненскай воласці ад 15 да 50 гадоў" за 1920 г. [8, арк. 32 – 33], "Спіс выбаршчыкаў Малькаўскага райсавета Лёзненскай воласці Віцебскага павета…" за 1923 г. [2, арк. 106], "Спіс вучняў, якія будуць наведваць школу дарослых пры Замашчанскай школе" за 1927 г. [5, арк. 8], "Спіс слухачоў Чарнаруцкага пункта ліквідацыі непісьменнасці" за 1928 г. [6, арк. 138], "Спіс гаспадарак, абкладаемых па даходах ад продажу сельгаспрадуктаў па завышаных цэнах на прыватным рынку" за 1932 г. [10, арк. 62] і інш. Аднак, да інфармацыі, атрыманай з дадзеных спісаў, трэба адносіцца вельмі крытычна. У прыватнасці, паводле ўказанага спіса за 1920 г., Загурскаму Міхаілу Платонавічу было 46 гадоў, а паводле спіса 1923 г. – 45 (адпаведна, ён мог нарадзіцца ў 1874 г. ці ў 1878 г.). Яшчэ больш недакладныя звесткі маюцца наконт Загурскага Зіновія Платонавіча: згодна з тымі ж спісамі, годам яго нараджэння можна лічыць як 1874 г., так і 1891 г.

Каштоўнымі крыніцамі з'яўляюцца ўсемагчымыя пасведчанні асоб і пашпарты, выдадзеныя для пераезду ў іншыя населеныя пункты. Найбольш важнай інфармацыяй, якую можна з іх атрымаць – гэта дакладная дата нараджэння асобы. Прыкладам можа служыць пашпарт Загурскага Аляксандра Зіноўевіча, выдадзены яму ў 1919 г. [3, арк. 20].

Пэўныя біяграфічныя звесткі пра сялян утрымліваюцца ў комплексе дакументаў, узніклых пры разглядзе зямельных пытанняў, якія былі надзвычай актуальнымі пры падзеле былых памешчыцкіх маёнткаў у першыя паслярэвалюцыйныя гады.Напрыклад, у акце падзелу былога маёнтка Прудзішча ад 12 ліпеня 1922 г. маюцца звесткі пра маёмасны стан сялян (плошчу зямельных надзелаў, колькасць жывёлы) [4, арк. 96]. У пастанове Асаблівай калегіі вышэйшага кантролю па спрэчных зямельных справах пры Народным Камісарыяце Земляробства БССР ад 17 красавіка 1925 г. адлюстраваны ўвесь працэс хадайніцтваў сялян пра надзяленне іх зямлёй за кошт тэрыторыі згаданага вышэй маёнтка [9, арк. 117 адв.].

Рэпазіторый ВДУ

Для даследавання сялянскіх радаводаў мэтазгодна выкарыстоўваць і судовыя справы. У прыватнасці, у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваецца справа па абвінавачванню Загурскага Васіля Сямёнавіча ў невыкананні плана па сяўбе сельскагаспадарчых культур у 1932 г. У пратаколе апытання падсуднага запісаны біяграфічныя звесткі (узрост, нацыянальнасць, адукацыя, памер сям'і і да т.п.), а таксама распавядаецца пра яго маёмасны стан [12, арк. 1 – 15].

Варта звярнуць увагу на тое, што інфармацыя генеалагічнага характару, датычная першай трэці XX ст., змяшчаецца і ў крыніцах больш позняга перыяду. У першую чаргу гаворка ідзе пра асабовыя справы супрацоўнікаў пэўных устаноў, а таксама справы сябраў КПСС. Найбольш інфарматыўнымі з дакументаў з'яўляюцца аўтабіяграфіі, у якіх згадваюцца звесткі пра сваякоў, а таксама лісткі па ўліку кадраў. Так, у дадзеным даследаванні выкарыстаны асабовая справа старшага інспектара па дзяржаўных даходах фінансавага аддзела Лёзненскага райвыканкама Загурскага Андрэя Пятровіча, сфармаванай з дакументаў 1945–1955 гг.[11], і справа па прыёму ў кампартыю Загурскага Уладзіміра Парфенавіча ў 1974 г. [14].

Каштоўнымі крыніцамі па аднаўленні сялянскіх радаводаў з'яўляюцца дакументы па назначэнні пенсій інвалідам Вялікай Айчыннай вайны ў другой палове 1940-х гг. У прыватнасці, у даведках, прыкладзеных да адпаведных пратаколаў, паіменна пералічаны ўсе члены сям'і інваліда ці загінулага вайскоўца з указаннем сваяцкіх сувязяў і года нараджэння [13, арк. 17, 24, 208].

Таксама пры ажыццяўленні генеалагічных даследаванняў неабходна выкарыстоўваць такія крыніцы, як надмагільныя помнікі, з дапамогай якіх можна ўстанавіць даты нараджэння і смерці асобы.

Важкім дапаўненнем да звестак, атрыманых з пералічаных вышэй крыніц, з'яўляюцца ўспаміны сваякоў ці аднавяскоўцаў. Яны не заўсёды дакладныя, але могуць паслужыць для ўстанаўлення сваяцкіх сувязяў паміж асобамі, атрымаць пэўныя факты, датычныя біяграфіі. Больш таго, пры вывучэнні роду Загурскіх менавіта шляхам апытання сваякоў былі ўстаноўлены імёны і прыкладны час жыцця 6-ці асоб, якія не згадваліся ў пісьмовых крыніцах.

У выніку аналізу разнастайных крыніц былі пабудаваны 2 генеалагічныя дрэвы роду Загурскіх (гл. схему). Іх пачынальнікі, верагодна, з'яўляліся сваякамі, бо пражывалі ў адным населеным пункце, але з-за адсутнасці дастатковай колькасці крыніц даказаць гэта пакуль што не ўдалося.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ў архівах захавалася абмежаваная колькасць неабходных дакументаў, сялянскі радавод магчыма давесці да пачатку XIX ст. Найбольш важнымі крыніцамі дарэвалюцыйнага перыяду варта лічыць метрычныя кнігі. Сярод матэрыялаў савецкага часу для генеалагічных даследаванняў асаблівае значэнне маюць усемагчымыя спісы сялян, пашпарты, справы па разглядзе зямельных пытанняў, асабовыя справы. Пры гэтым галоўным у справе аналіза пералічаных матэрыялаў павінен з'яўляцца крытычны падыход.


1. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 1. – Мінск : БелНДІДАС, 2002. – 493 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 104. Воп. 2. Спр. 22.
3. ДАВВ. – Ф. 144. Воп. 1. Спр. 8.
4. ДАВВ. – Ф. 144. Воп. 1. Спр. 298.
5. ДАВВ. – Ф. 160. Воп. 11. Спр. 12.
6. ДАВВ. – Ф. 160. Воп. 11. Спр. 20.
7. ДАВВ. – Ф. 160. Воп. 11. Спр. 30.
8. ДАВВ. – Ф. 221. Воп. 1. Спр. 68.
9. ДАВВ. – Ф. 1005. Воп. 3. Спр. 179.
10. ДАВВ. – Ф. 1264. Воп. 1. Спр. 14.
11. ДАВВ. – Ф. 1264. Воп. 2. Спр. 46.
12. ДАВВ. – Ф. 1820. Воп. 1. Спр. 843.
13. ДАВВ. – Ф. 2931. Воп. 4. Спр. 16.
14. ДАВВ. – Ф. 88-п. Воп. 39. Спр. 40.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2014. Воп. 1. Спр. 1306.
16. НГАБ. – Ф. 2197. Воп. 1. Спр. 8.
17. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 2. Спр. 32. Арк. 88 – 119. Спр. 33. Арк. 78 – 110. Спр. 34. Арк. 81 – 117. Спр. 35. Арк. 42 – 77. Спр. 145. Арк. 108 – 151. Спр. 146. Арк. 78 – 110. Спр. 151.
18. Рыбчонок, С. Комплексы основных генеалогических источников в Национальном историческом архиве Беларуси / С. Рыбчонок // Архівы і справаводства. – 2007. – № 5. – С. 88–95.
19. Урублеўскі, В. Генеалогія: час адраджэння. Рэкамендацыі па росшуку свайго радаводу / В. Урублеўскі // Краязнаўчая газета. – 2010. – № 25. – С. 5.
20. Яцкевіч, З. Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты / З. Яцкевіч. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. – 494 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

## Генеалагічнае дрэва Загурскіх

- Улас (? - ?) + ?
  - Яўстафій (1816 - ?) + 26.01.1841 Пелагея Дзямідаўна (1823 – 21.09.1872)
    - Андрэй (1842 – 04.07.1842)
    - Марына (1847 – 26.02.1849)
    - Варвара (1849 – 21.03.1850)
    - Фёдар (? – ?) + Феадосія Іванаўна (? – ?)
      - Кацярына (23.11.1875 – ?)
      - Анастасія (18.05.1878 – ?)
      - Васа (06.03.1881 – ?)
    - Нікіфар (1855 – ?) + 15.10.1878 Феадора Аляксееўна (1858 – ?)
    - Платон (? – ?) + Кацярына Кандрацьеўна (? – ?)
      - Зіновій (1861 – 04.1944) + Лукер'я Іларыёнаўна Шуфранава (1870 – 1945)
        - Аляксандр (30.08.1901 – 1939)
        - Ульяна (1902 – ?)
        - Парфен (07.01.1906 – 11.05.1982)
        - Аляксандра (1910 – 1983)
        - Марыя (1910 – ?)
        - Міхаіл (1912 – 1944)
        - Анастасія (нар. 1918 г.)
        - Аўгіння (? – 1930-я гг.)
        - Алена (? – 1930-я гг.)
        - Мар'я (? – ?)
        - Вольга (? – ?)
        - Цукліда (? – 1940-я гг.)
        - Уліта (? – ?)
      - Васа (19.08.1871 – ?)
      - Міхаіл (1870-я гг. – ?) + Усцінbackslashня Якаўлеўна (? – ?)
        - Іван (1901 – 03.1944)
        - Лізавета (1910 – ?)
        - Андрэй (1921 – ?)
        - Ефрасіння (1924 – ?)
        - Кацярына (? – ?)
      - Пётр (18.07.1881–1918) + Еўдакія Міходзьеўна Камісарава (1880-я гг. – ?)
        - Паліна (1914 – ?)
        - Андрэй (07.06.1916 – 24.07.1959)
        - Сцяпан (20.05.1918 – 19.12.1985)
      - Мікалай (1882 – 07.04.1978) + Ефрасіння (1884 – ?)
        - Еўдакія (14.03.1911 – 14.06.1999)
        - Антаніна (18.03.1912 – 31.10.1997)
    - Сямён (? – ?) + ?
      - Васіль (1880-я гг. – ?) + 1. Мар'я (? – ?); + 2. ?
        - Яўхім (24.03.1914 – 26.02.2009)
        - Варвара (19.12.1921 – 23.01.1959)
        - Анастасія (? – ?)
        - Міхаіл (1928 – ?)

Репозиторий ВГУ